# У БДУ абмеркавалі ролю жанчын-вучоных Саюзнай дзяржавы ў сучасным свеце

21.11.2024 **Аўтар: Алена Вінаградава**

**У мерапрыемстве прынялі ўдзел кіраўнік прадстаўніцтва Пастаяннага камітэта Саюзнай дзяржавы ў Мінску Мар'яна ШЧОТКІНА, рэктар БДУ Андрэй КАРОЛЬ, намеснік старшыні ГА «БСЖ» Наталля КАРЧЭЎСКАЯ, прарэктар па ідэалагічнай і выхаваўчай рабоце БДУ Ганна БАКУН, а таксама кіраўнікі ВНУ Беларусі і вучоныя.**

Расія і Беларусь узаемадзейнічаюць у самых розных сферах жыццядзейнасці грамадства. Праграмы, якія прымаюцца і ажыццяўляюцца Саюзнай дзяржавай, уносяць у гэта ўзаемадзеянне канкрэтыку, робяць яго эфектыўнай. Космас, электроніка і мікраэлектроніка, забеспячэнне бяспекі, прамысловасць, сельская гаспадарка — далёка не ўсе галіны паспяховага супрацоўніцтва дзвюх брацкіх краін.

— Ва ўсім гэтым важная роля навукоўцаў, таму што яны генеруюць ідэі, увасабляюць іх у жыццё, ствараюць мадэлі, новыя матэрыялы, тэхналогіі, лекі, — сказала Мар'яна Шчоткіна. І дадала, што жанчыны-навукоўцы іграюць у гэтай сферы не апошнюю ролю.

Па словах кіраўніка прадстаўніцтва, трэба прыцягваць у навуку дзяўчат са студэнцкай лавы, таму што важна, каб навука маладзела. Важна прыцягваць працуючых жанчын, таму што ў іх закладзены вялікі патэнцыял, які будзе рухаць навуку Саюзнай дзяржавы толькі наперад.



Андрэй Кароль адзначыў, што «круглы стол» з такой тэматыкай — само па сабе ўнікальнае і значнае мерапрыемства. Паводле яго слоў, рэчаіснасць напоўнена неабмежаванымі аб'ёмамі хуткасцей, стратай сэнсаў і няздольнасцю чалавекам пачуваць сябе і іншых. А гэтае навукова-асветніцкае мерапрыемства накіравана на пошукі спосабаў пераадолення выклікаў сучаснасці. Характэрна, паводле слоў кіраўніка ВНУ, што круглы стол аб'яднаў жанчын-навукоўцаў самых розных сфер.

— Звычайна мерапрыемствы, у якіх даводзіцца ўдзельнічаць, маюць розную ступень прадуктыўнасці, — канстатаваў ён. — Сённяшняе, прысвечанае ролі жанчын-навукоўцаў Саюзнай дзяржавы, аказалася і прыгожым, і на рэдкасць стваральным, напоўненым глыбінёй, гумарам і смелымі ідэямі. Напярэдадні адкрыцця ўспомнілася думка вядомага псіхааналітыка Карла Юнга, якую прыводзіць яго біёграф Роберт Робінсан: набліжаецца эра жаночага пачатку. І гэты наступ таксама няўхільны, як і раставанне леднікоў. Цяперашняе стагоддзе хуткасцяў, не чутнасці чалавекам сябе і іншых, аб’ёмаў задавальнення і агрэсіі — прадвеснікі гэтай эры.

**Першачарговую місію жанчыны, якая заключаецца ў стваральнай сіле, адзначыла Наталля Карчэўская і выказала спадзяванне, што сустрэча дапаможа знайсці новыя перспектыўныя рашэнні актуальных запытаў грамадства і краін Саюзнай дзяржавы.**

У ходзе пасяджэння эксперты дзяліліся даследаваннямі аб развіцці жаночага руху ў навуковым, акадэмічным і сацыяльным асяроддзі. Загадчыца кафедры грамадзянскага права і працэсу і міжнароднага прыватнага права Юрыдычнага інстытута РУДН ім. Патрыса Лумумбы Яўгенія ФРАЛОВА падрыхтавала даклад «І жаночая справа таксама», у якой расказала пра ролю, значнасць і ўклад у развіцці розных сфер жыцця грамадства жанчын-навукоўцаў розных эпох. Варта адзначыць, што менавіта Яўгенія Фралова актыўна развівае навуковыя сувязі юрыдычнай адукацыі Беларусі і Расіі, у прыватнасці, яна аказала асабістае садзейнічанне ў перадачы Белдзяржуніверсітэту з Масквы больш за тысячу кніг.

**Фота: БДУ**